# Літаратура Сярэднявечча



- Развіццё культуры ў гэты час праходзіла ў цеснай сувязі з працэсам фарміравання дзяржаўнасці на Беларусі. Магутны штуршок для з'яўлення культуры новага тыпу і культурнага ўздыму на беларускіх землях дало прыняцце хрысціянства.
  Ускладненне грамадскай і гаспадарчай дзейнасці разам з прыняццем хрысціянства абумовілі развіццё з канца X ст. пісьменства. Матэрыялам для пісьма служыў пергамент, пакрытыя воскам дошчачкі і бяроста, на якіх стылямі (пісаламі) надрапвалі надпісы.
- Надпісы рабілі таксама на камянях, цэгле, металічных пячатках, званах, прасліцах, касцяных вырабах і інш.



- Самым старажытным помнікам пісьменства на Беларусі і першым датаваным надпісам на ўсёй тэрыторыі Усходняй Еўропы з'яўляецца надпіс на пячатцы полацкага князя Ізяслава (канец X ст.).





- Пісьменства на Беларусі прадстаўлена таксама надпісамі на так званых Барысавых камянях; берасцянымі граматамі, знойдзенымі ў Віцебску і Мсціславе; на крыжы Ефрасінні Полацкай, на цаглінах полацкага Сафійскага сабора (адзначаны імёны яго будаўнікоў) і г.д.






# Барысавы камні

- Барысавы камяні — манументальныя помнікі эпіграфікі XII ст. ў Беларусі: 7 вялікіх валуноў з высечанамі на іх 6-канцовымі крыжамі і надпісамі «Господи помози…».
  Назву атрымалі ад імя князя полацкага Рагвалода Усяславіча — у хрышчэнні Барыса.






# Рагвалодаў камень

- Фотаздымак 1896 года. Рагвалодаў камень змешчаны ў існаваўшай у той час царкве святых Барыса і Глеба.

- РАГВАЛОДАЎ КАМЕНЬ
  Прымыкае да вышэйзгаданых камянёў і знаходзіўся каля в. Дзятлаўка Аршанскага раёна.

  Камень меў выяву шасціканцовага крыжа на двухступеньчатай Галгофе і кругавы надпіс, які можна прачытаць як:



- Рагвалодаў камень не захаваўся да нашага часу. Было прынята рашэнне аднавіць страчаную гісторыка-культурную каштоўнасць .

І 6 верасня 1998 года падчас святкавання Дня беларускага пісьменства каля Музея гісторыі і культуры г.Оршы адбылося ўрачыстае адкрыццё копіі Рагвалодава камня.





Тураўскае Евангелле

- У XI-XII стст. на тэрыторыі сучаснай Беларусі пачалося перапісванне кніг. Гэтым займаліся ў майстэрнях - скрыпторыях, якія ствараліся пры манастырах. Самая старажытная рукапісная кніга – Тураўскае Евангелле (XI ст.).



- Тураўскае Евангелле («Тураўскія лісткі») — рукапіснае Евангелле, створанае ў XI стагоддзі, тэкст напісаны кірыліцай. Захоўваецца ў бібліятэцы Акадэміі навук Літвы. Тураўскае Евангелле з'яўляецца адным з найстаражытнейшых помнікаў славянскай пісьменнасці.







# Дзякуй за ўвагу

